# 2024 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

***Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.***

***У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2024 год з'яўляецца юбілейным.***

# 65 гадоў

**Броўка, П.  Пахне чабор : Вершы / Пятрусь Броўка. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1959. – 123, [1] с.**



У 2024 годзе адзначаецца 65 гадоў з моманту першага выдання зборніка твораў Петруся Броўкі (1905–1980) «Пахне чабор». Тыраж выдання – 5 000 экзэмпляраў.

Гэта была 16-я кніга паэзіі ў творчай біяграфіі пісьменніка. Пасля яе будзе выдадзена яшчэ амаль столькі ж... Здавалася б, нічога асаблівага. Але менавіта гэты «медыянны» зборнік у першую чаргу атаясамліваецца з аўтарам. Вершы «Як ліст дубовы...», «Ты, мая пчолка», «Пахне чабор...», «Калі надыдзе час спачыну...» і мн. іншыя, што ўвайшлі ў кнігу, служаць прыкладам самай высокай паэзіі ў творчасці Петруся Броўкі, бо вызначаюцца лірычнасцю і шчырасцю і адносяцца да найлепшых узораў беларускай нацыянальнай і еўрапейскай інтымнай лірыкі.



# «Пахне чабор» : 65 гадоў

Назва зборніку дадзена па аднайменным вершы «Пахне чабор», напісаным у 1957 годзе і прысвечаным першаму каханню. Гэта верш-споведзь, у якім выяўляецца цэлая гама пачуццяў: і лёгкі сум аб юнацтве і першым каханні, і рамантычная ўзнёсласць, і дакор сабе за нерашучасць… Па меркаванні літаратурных крытыкаў, верш з’яўляецца красамоўным сведчаннем таго, што сапраўдная паэзія здольна ўзняць на вышыню эстэтычнага гучання звычайны жыццёвы факт, што назаўсёды застаўся ў памяці паэта:

Хіба на вечар той можна забыцца?
…Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,
Штосьці спявае пяшчотнае бор,
Пахне чабор,
Пахце чабор...
Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы.
Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,
Быццам абсыпана промнямі зор.
Пахне чабор,
Пахце чабор...

Як слушна пісаў А. Бельскі, «верш прасякнуты элегічным пачуццём, у ім праз драматызацыю лірычнай інтанацыі раскрываецца туга чалавечай душы па былым каханні».

# «Пахне чабор» : 65 гадоў

Людміла Рублеўская ў адной публікацыі, прысвечанай 60-гадоваму юбілею выдання зборніка «Пахне чабор», пісала: «Знайшла цікавую тэорыю, чаму для верша выбрана менавіта такая зёлка. Навуковая назва чабора звычайнага – Thymus serpyllum, ад грэчаскага слова thyo – ахвярапрынашэнне, паколькі траву кідалі ў агонь у час такой цырымоніі. Вось і герой нібыта прыносіць сваё каханне ў ахвяру нерашучасці. Але знайшла і ўспаміны, запісаныя ад аднасяльчанкі Петруся Броўкі А. Ф. Рыбчак. Тая згадвае, што сапраўды ў юнага Петруся была каханая дзяўчына, прыгажуня і працаўніца, з якой яны сустракаліся звычайна каля вялікага валуна напрыканцы вёскі. І сапраўды тая дзяўчына насіла беленькую хустачку. А за месцам спаткання, ля Пуцілкавічаў, быў луг, парослы чаборам. У вёсцы гэтую зёлку называлі «чомбар», запарвалі як чай. Валун пасля знік, калі пашыралі дарогу. А шэдэўр, народжаны шчырым, чыстым пачуццём, хараством роднай прыроды і, зразумела, пахам чабору, застаўся».

*Людміла Рублеўская (Крыніца: СБ – Беларусь сегодня)*

# «Пахне чабор» : 65 гадоў

●Верш «Пахне чабор» Петруся Броўкі чыталі са сцэны вядомыя артысты Павел Дубашынскі, Аляксандр Каляда і іншыя. Твор не раз быў пакладзены на музыку: У. Г. Мулявін напісаў песню, якая ў 1976 годзе была ўключана ў рэпертуар «Песняроў» і стала хітом; хітом у свой час была і песня ў выкананні ВІА «Верасы», напісаная кампазітарам В. К. Івановым (https://www.youtube.com/watch?v=qYrutbT8lKY); кампазітар В. А. Пецько па матывах верша напісаў раманс (ttps://www.youtube.com/watch?v=zgd7z_97F2A).

●У 2011 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» быў падрыхтаваны і выдадзены яшчэ адзін зборнік твораў Петруся Броўкі пад назвай «Пахне чабор». Аб'ём гэтага выдання – 230 старонак, што амаль удвая больш, чым у зборніку 1959 года. У новую кнігу ўвайшлі многія знакамітыя творы паэта, напісаныя ўжо ў пазнейшыя дзесяцігоддзі. Сярод іх і «Александрына» – верш, што, як і «Пахне чабор», непаўторна загучаў ў выкананні знакамітага ансамбля «Песняры; і праграмны верш «Калі ласка!», у якім выказваецца шчырая любоў і замілаванне роднай мовай; і ліра-маналагічная паэма «Голас сэрца», прысвечаная маці паэта Алёне Сцяпанаўне, якая ў 1943 годзе загінула ў Асвенціме; і мн. інш

